# Яўгенія Янішчыц – зорка беларускага Палесся



Будзе вечна
Блізкім рэхам
Звінець твой
Голас малады!!!

Нарадзілася Яўгенія 29 лістапада 1948 года
ў вёсцы Рудка Пінскага раёна
Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.



*Я.Янішчыц у дзяцінстве*

Жэня Янішчыц скончыла Рудкаўскую пачатковую школу,потым Мерчыцкую сямігодку,
а потым ў 1966 годзе – Парэцкую сярэднюю школу.



ПАРЭЦКАЯ БАЗАВАЯ ШКОЛА

Я.Янішчыц сярод аднакласснікаў (сядзіць злева)






У школьным музеі

Свой першы верш яна напісала,
калі вучылася ў Мерчыцкай школе,
будучы сямікласніцай



Першы свой верш назвала
“ГОЛУБ”,
які быў надрукаваны ў раёнцы
“Палеская Праўда”



Будучы вучаніцай 10 класа
Парэцкай сярэдняй школы,
Жэня Янішчыц стала пераможцай
конкурса юных паэтаў



У 1967 годзе сям‘я Жэні пераязджала
з вёскі Рудка ў Велясніцу.
Тады на гарышчы паклалі розныя рэчы,
а разам з імі і сшыткі Жэні з вершамі.



# Вось напрыклад некалькі рукапісаў вершаў Жэні:





Роднаму Пінску

Ты стаіш над палескаю Пінаю,
Што дзеючы морам агнёў.
Над тваімі дамамі — машынамі
Дзень сапраўднага шчасця ўзышоў.

Караблі адплываюць ад прыстані,
Будзяць горад сірэнай гудкоў.
Я іду. Цішыня урачыстая
Даносіцца за гоман лясоў.

Добры дзень, старажытны мой над Пінаю,
Я з усмешкай вітаю цябе.
Сэрцам юным, душою арлінаю
Шчасця вечна жадаю табе.

Добры дзень, мае людзі цудоўныя,
Што жывеце над Пінай — ракой!
Зычу поспехаў вам ва выпадках я,
Верш напамяць і свой.

Родны Пінск! Да цябе я звяртаюся,
Тваё тысячы год тут стаяць.
Над табою няхай не згасаючы,
Зоры вечнага шчасця гараць.

Ж. Анішчыц
26. V. 1964 г.



Мая настаўніца

Не бачыла дарог ніколькі,
Жыць, змагацца, вечна змагацца
Птушкай я вылятала са школы
Мне [illegible] настаўніца
Ахмялеўшай,
~~Нева сінь у вагах ...~~ У вялікіх гарах бягу за ваколіцу,
Ах, а вецер сустрэчны калючы
Ў ма вуха шэпча ад мяцелі
Сэрца радасна светлай поўніцца
Ў, здаецца, праўдзе воч грудзі
Як мяне помняцца, ўспомні помняцца
Мае першыя
суддзі-людзі.
Я ўбачыла ў такой узрушанай,
~~Дзесь~~ та за лясной загадзіверы.
О, як дзіўна цвіце ігрушына,
О, як хораша жыць і верыць.

Ж. Янішчыц

Рукапіс верша Ж. Янішчыц



Вясной

Выплыў месяц з-пад блакітнай хмаркі;
Вокам зыркім глянуўшы на дол.
Засвяціўся хораша і ярка,
Што ўсё заззяла навакол.

Белы бэз ля плоту прытуліўся,
Ясельдзе наставіўшы руку.
Ў праменнаў венік утапіўся
Ў вясновым звонкім ручайку.

Зелянее жыта на палетках,
У сажалцы лягушкі ажылі.
Зацвілі рабінавыя кветкі,
Ў небе сінім птушкі паплылі.

Гусі ў адзенні бела-сізым
Скрыліся ў аблоках чарадой.
Хоць — пішы радкі, малюй эскіз,
Хоць — любуйся шчодраю вясной.

Ж. Янішчыц. 13.II-64 г.

**Рукапіс верша “Вясной”, напісанагша ў 1964 годзе**

**Шмат вершаў прысвяціла свайму духоўнаму настаўніку Фёдару Фёдаравічу Цудзіла,**

**які не толькі падказаў, заўважыў**

**...ычнага**





ФРАГМЕНТ СТЭНДА З МУЗЕЯ Я.ЯНІШЧЫЦ З ПАРТРЭТАМ НАСТАЎНІКА ЦУДЗІЛЫ Ф.Ф.

## У старэйшых класах Жэня вяла перапіску з Нілам Гілевічам.



Добры дзень,
дарагі Ніл Сямёнавіч!
Атрымала Ваш ліст,
за які сардэчна дзякую.
А ведаеце, я вельмі хвалявалася,
калі аддала на Ваш суд
вершы. Яшчэ і сёння адчуваю,
што і ў добрых тых вершах,
якія адабралі для зборніка,
ёсць агрэхі. У апошні час
прадаўжаю настойліва шукаць
сябе ў вершах.
Мне таксама вельмі
хацелася пагутарыць з Вамі.
Спачуваю. Бо калі б, нават,
прапанавалі прыехаць на з'езд
пісьменнікаў, то не змагу.
Справа ў тым, што 18 мая
у нас апошні школьны званок,
а 25 мая першы экзамен.
За апошні час напісала
некалькі новых вершаў. Спадзяю-
ся, што Вы іх хутка атрыма-
еце. Шчыра прызнацца, нішто
на мяне так не ўздзейнічае,
як вясна.

Вось, здаецца, і ўсё.
Будзе час — сустрэнемся.
Хацелася б пачуць Вашае
крытычнае слова.

З прывітаннем і
з вялікай удзячнасцю
Жэня Янішчыц

26, красавік. 1966 г.





На вершы Я.Янішчыц выконваліся песні

Разам з Ю.Голубам на 15 з’ездзе пісьменнікаў Беларусі ў 1986 годзе





Я.Янішчыц побач з А.Разанавым



**На вечары паэзіі маладых. 1978 год**

**Аўтографы маладым. 1987 год**





*Я.Янішчыц і З.Прыгодзіч.*
*1978 год*



**М.Танк і Я.Янішчыц.**
**1980 год**



**Паэтэсса з калегамі.**
**Злева на права:**
**А.Марціновіч,М.Дукса,**
**Ю.Голуб,Я.Янішчыц,**
**Г.Далідовіч,Л.Дайнека,**
**М.Федзюковіч**



З Іванам Шамякіным. 1978 год



На кніжнай ярмарцы на пл. Якуба Коласа ў Мінску выступае С.Законнікаў



**Сярод калег на Пленуме Саюза Пісьменніка ў Беларусі.** *1983* **год**



**На літаратурным вечары ў Барысаве.** *1985*

# 19 жніўня 1971 года Яўгенія Янішчыц выйшла замуж за паэта Сяргея Панізніка



Ніл Гілевіч віншуе Я.Янішчыц
і С.Панізніка з вяселлем

# Праз час у маладых нарадзіўся сын Андрэй





Але ці шлюб не вытрымаў выпрабаванне славай, ці сапраўды любоўная лодка разбілася аб быт.

Дзве душы, мабыць, замкнуліся адна на адной і сталі ў сваім развіцці, што асабліва згубна для  творчых асоб. Стала цесна, не хапала паветра…

Янішчыц засталася з сынам, творчасцю і кар’ерай…



## Ліст да сяброўкі Тамары Аўсяннікавай:

«Милая Тамарка, здравствуй!
Извини, что тебе долго не писала, таким тягостным и трудным для меня было последнее время  минувшего года, что врагу, как говорится, не пожелаешь. Но всё окончилось.
<…> трудно и горько об этом вспоминать, тем более – писать.
<…> Как бы ни было трудно, всеми силами старайся сохранять семью…
Одиночество – это невесёлое дело»

Жэня хадзіла па зямлі, а жыла нябёсамі.
І аднойчы вырашыла спазнаць вышыню да канца.
25 лістапада 1988 года, праз 5 дзён пасля свайго дня нараджэння яна ступіла "у вечнасць" з восьмага паветра…





Няхай грамы пeратрасаюць,
Пераварочваюць мой шлях,
Але гудзе любові крылле,
Шчаслівы славячы прыгнёт.
Жыццё маё ,і там ,на
схіле,

З мэтай ушанаваць памяць
“палескай зоркі” быў адкрыты музей
21 лістапада 1998 года
да 50-годдзя паэтэсы.
Размешчаны ў Парэцкай базавай
школе, дзе вучылася Я.Янішчыц.


Паказальнік да літаратурнага музея Я. Янішчыц.





## Тут размешчаны музей Я. Янішчыц



**А.П.Сідарук сабрала першакрыніцы творчасці Яўгеніі Янішчыц**



**Адна з экспазіцый літаратурнага музея Яўгеніі Янішчыц**

**Сшыткі з першымі паэтычнымі пробамі Жэні**





Кніга водгукаў у літаратурным музеі Я.Янішчыц

У сакавіку 1998 года было вырашана надаць імя Я.Янішчыц раённай цэнтральнай бібліятэцы.

У горадзе Пінску яе імем названа вуліца ў новым мікраараёне.

"Запомніце мяне,якая ёсць!" – радкі з верша Я.Янішчыц. Мы павінны зрабіць усё, каб яны здзейсніліся, каб Зорка Яўгеніі Янішчыц ніколі не згасла, а з кожным годам разгаралася ўсё ярчэй і ярчэй.





Такой прысні, як яблыневы сад.
Там не ачахла сонечная сцежка.
Хвалюецца высокі снегапад,
А на губах – іскрыстая ўсмешка…
Запамятай такою, як была,
Здзірала як нясцерпныя кляйноты.
Смяюцца вочы, поўныя святла.
А на губах – гарчавінкі самоты.

# Дзякую за ўвагу!!!